**Н. У. Чайка (Мінск, Беларусь)**

# КАМПЕНСАТОРНАЯ ПРЫКМЕТА ЯК ПАРАМЕТР СІСТЭМАТЫЗАЦЫІ КАНСТРУКЦЫЙ З ІМПЛІЦЫТНАЙ СЕМАНТЫКАЙ

Структурна-сінтаксічныя мадыфікацыі ў беларускай мове (канструкцыі з эліпсісам, парцэляцыяй, сінтаксічнай рэдукцыяй і кампрэсіяй імпліцытнай семантыкай і інш.) вывучаліся пераважна з выкарыстаннем метадалагічных прыёмаў структурнага і семантычнага сінтаксісу. Падобны аналіз выяўляў асаблівасці іх структурнай і семантычнай арганізацыі ў параўнанні з поўнымі сказамі. Падобныя метады даследавання з’яўляліся непрыдатнымі, бо не вызначалі іх спецыфічную асаблівасць і заканамернасці функцыянавання.

Для аналізу і сістэматызацыі адзінак дынамічнага сінтаксісу прапануем выкрыстоўваць распрацаваную намі *метадалогію кампенсаторнай сінтаксічнай тыпалогіі,* сутнасць якой заключаецца ў замяшчэнні мадыфіка-ваных і прапушчаных кампанентаў адзінкамі іншых моўных узроўняў. Напрыклад, ідэнтыфікацыяй семантыкі словаформы ў вытворных канструк-цыях выступае трансфармацыйная парадыгма, таму і сістэматызацыю лічым мэтазгодным праводзіць у адпаведнасці з гэтай прыкметай. За аснову тыпалогіі вытворных канструкцый, на наш погляд, павінен быць узяты характар сінтаксічнай сувязі – канстантны або пераменны. Важным пара-метрам таксама выступае функцыя кампанента – рэляцыйная або прэдыка-тыўная. На аснове такіх параметраў канструкцыю *Сцяпан – у салдатах. Тры гады ўжо* (З. Бядуля) можна кваліфікаваць як канстантна-непераў-тваральную прэдыкатыўную, а канструкцыю *То баль, то – ў пострыг. Гэта несур’ёзна* (Р. Баравікова) як канстантна-пераўтваральную прэдыка-тыўную, канструкцыю *У позірках – і радасць, і вясна* (Янка Брыль) як канструкцыю пераменна-пераўтваральную рэляцыйную. Такая класіфікацыя, нанаш погляд, магла б ахапіць усе сінанімічныя сінтаксічныя пераўтварэнні
і перафразаванні.

Канструкцыі з імпліцытнай семантыкай таксама могуць атрымаць кваліфікацыю ў адпаведнасці з кампенсаторнай прыкметай. Паколькі імпліцытную семантыку канструкцыя набывае ў выніку логіка-семантычных адносін паміж кампанентамі звышфразавага адзінства, значыць, іх і трэба разглядаць у якасці спосабаў кампенсацыі сэнсу. На наш погляд, у аснову класіфікацыі падобных з’яў неабходна пакласці від логіка-семантычных адносін, што выконвае кампенсаторную функцыю. Напрыклад, канструкцыю тыпу – *Вольга, мы будзем вянчацца? – Ты забыўся, што я камсамолка!* можна кваліфікаваць як адмоўна-прычынны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тып на той падставе, што імпліцытную семантыку адмоўя канструкцыя набывае ў выніку пэўнай лагічнай аперацыі. У дадзеным выпадку канструкцыя *Ты забыўся, што я камсамолка!* змяшчае прычыну ў дачыненні да прамой семантыкі – адмоўя: *Мы вянчацца не будзем. Прычына таму наступная: я камсамолка.* Падобныя канструкцыі могуць змяшчаць пасылку ў дачыненні да адмоўя, і таму кваліфікацыя іх павінна быць адпаведнай – адмоўна-пасылкавы тып: З я з ю л я . *Ты тут ні пры чым. За ўсё адкажу сам.* Б о н д а р . *Хіба я пра гэта? Не маглі без парторга! Парушэнне!* З я з ю л я . *А што прапануеш – брыгадзірам?* З я з ю л я . ***Яшчэ адзін!*** *Статут партыі ведаеш?* (А. Дзялендзік) або М у ж ч ы н а ў с к у р а н ы м п і н ж а к у . *Толькі за тое, што адмовіўся выручыць суседзяў і здаць да-даткова пяцьдзесят тон збожжа...* З я з ю л я *(абурыўся).* ***У мяне што – бразільскі клімат, іншае сонца?! Няхай працуюць!*** (А. Дзялендзік).

Станоўча-прычынны тып падразумявае адказ на пытанне, які змяшчае згоду: В е р а б ' ё ў . *Санаторый у калгасе! Ён вельмі вам патрэбны?* З я з ю л я . *Здароўе народа – вышэй за ўсё* (А. Дзялендзік) або *Два вусені валакуць Матыля, той упіраецца.* АСОТ. *(Грозна.) А гэта што такое?* ВУСЕНІ *(разгубіўшыся).* ***Нам загадана... Вы самі...*** (Г. Каржанеўская).

На нашу думку, падобны падыход зможа даць вычарпальную характарыстыку канструкцыям з імпліцытнай семантыкай і выявіць заканамернасці іх функцыянавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ